УДК 947.6(075.8)
ББК 63.3(4Бел)я73
К666

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ,
рэкамендавана секцыяй гуманітарных навук БДПУ
(пратакол № 7 ад 29.03.05)

*Рэцэнзенты:*
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *А. П. Жытко;*
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры новай і навейшай гісторыі БДПУ *П. А. Тупік*

**Корзюк, А. А.**
К666 Шляхі фарміравання пазнавальнага інтарэсу вучняў у працэсе вывучэння гісторыі Беларусі ў школе (канец XVIII – пачатак XX ст.) : метад. дапам. / А. А. Корзюк; пад навук. рэд. І. І. Багдановіча. — Мн. : БДПУ, 2005. — 47 с.

У дапаможніку прапанаваны разнастайныя варыянты ўрокаў, змешчаны праблемныя заданні. Даюцца фрагменты з твораў мастацкай літаратуры. Выкарыстаны вопыт вывучэння ваенна-гістарычнага і культурна-гістарычнага матэрыялаў.

Адрасуецца студэнтам гістарычнага факультэта БДПУ.

УДК 947.6(075.8)
ББК 63.3(4Бел)я73

© Корзюк, А. А., 2005
© ВВЦ БДПУ, 2005

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

**А. А. Корзюк**

# ШЛЯХІ ФАРМІРАВАННЯ ПАЗНАВАЛЬНАГА ІНТАРЭСУ ВУЧНЯЎ У ПРАЦЭСЕ ВЫВУЧЭННЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ШКОЛЕ (КАНЕЦ XVIII – ПАЧАТАК XX ст.)

*Метадычны дапаможнік*

8991
бібліятэка
БДПУ імя М. Танка

Мінск 2005

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

навучання датычацца больш шырокага выкарыстання нестандартных урокаў (урокаў–канферэнцый, урокаў-роздумаў, відэаўрокаў і г.д.), а таксама метадычных прыёмаў (гульняў, тэстаў, драматызацый, персаніфікацый і інш.), асабліва па вывучэнню гісторыі беларускай культуры. Большая ўвага павінна надавацца рабоце непасрэдна з тэкстам і матэрыяламі падручніка і вучэбных дапаможнікаў. Таму ў прапануемым намі дапаможніку прыводзяцца розныя варыянты арганізацыі пазнавальнай дзейнасці з выкарыстаннем падручніка.

Яго матэрыялы можна выкарыстоўваць як пры рабоце з вучэбным дапаможнікам М.В. Біча "Гісторыя Беларусі. Канец 18 ст. – 1917 г. " пад рэдакцыяй акадэміка Я.М. Бабосава, так і пры вывучэнні асобных тэм па іншых падручніках і вучэбных дапаможніках па гісторыі Беларусі для 8 класа.

Распрацаваныя планы ўрокаў накіраваны на развіцце неабходных агульнавучэбных і спецыяльна-гістарычных уменняў і навыкаў вучняў, якія, безумоўна, паспрыяюць павышэнню якасці выкладання і разумення гісторыі, што, на нашу думку, станоўча паўплывае на рост цікавасці да гісторыі Беларусі і паспрыяе павышэнню эфектыўнасці яе выкладання. Практычную накіраванасць маюць уключаныя ў дадатак памяткі, якія спрыяюць удасканаленню спосабаў дзейнасці вучняў з гістарычным матэрыялам. Апрабіраваны аўтарам у практыцы выкладання ў гімназіі № 11 г. Мінска і асветлены ў дапаможніку вопыт вывучэння ваенна-гістарычнага і культурна-гістарычнага матэрыялу прапануецца выкарыстоўваць настаўнікам і студэнтам-практыкантам у працэсе арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў 8 класаў на ўроках гісторыі Беларусі.



## 1. ВЫВУЧЭННЕ ВАЕННА-ГІСТАРЫЧНАГА МАТЭРЫЯЛУ

Вывучэнню ваеннай гісторыі ў 8 класе прысвечаны два параграфы–"Лёс Беларусі ў вайне 1812 г." і "Становішча Беларусі ў гады Першай Сусветнай вайны". Да гэтай тэматыкі цесна прымыкае вывучэнне паўстанняў 1830 – 1831 гг. і 1863 – 1864 гг. на Беларусі.

У працэсе вывучэння ваеннай гісторыі Бацькаўшчыны праз прымяненне разнастайных форм і метадаў работы неабходна спрыяць фарміраванню ў вучняў такіх спосабаў дзейнасці, як складанне храналагічных табліц, абагульненне гістарычных фактаў і фармуліраванне на іх падставе высноў, вызначэнне прычынна-выніковых сувязей, самастойнае вывучэнне матэрыяла падручніка, складанне разгорнутага плана вучэбнай інфармацыі, выкарыстанне гістарычнай карты як крыніцы ведаў, вызначэнне разнастайных міжпрадметных сувязей, удзел у абмеркаванні гістарычных з'яў і падзей, вызначэнне сваіх адносін да іх.

На развіццё гэтых уменняў і навыкаў накіравана прапануемая намі методыка засваення новага матэрыялу на ўроках, прысвечаных вывучэнню пералічаных вышэй тэм.

### Тэма "Лёс Беларусі ў вайне 1812 г." (§2)

У ходзе ўрока, абапіраючыся на раней вывучаны ў 7 класе і ў курсе сусветнай гісторыі 8 класа ваенна-гістарычны матэрыял, вучні павінны ўспомніць і вызначыць прычыны вайны, засвоіць яе ход і вынікі, усвядоміць удзел і лёс беларускага народу ў ёй.

На ўроку неабходна працягваць развіцце ў вучняў уменняў характарызаваць войны і баявыя дзеянні, вылучаць прычынна-выніковыя сувязі, працаваць з храналогіяй і гістарычнай картай, ў мікрагрупах па выкананні вучэбна-пазнавальных заданняў.

Ідэйна-выхаваўчая накіраванасць урока заключаецца ў шырокіх магчымасцях выхавання ў вучняў гуманізму, патрыятычных пачуццяў, павагі да свабоды і незалежнасці сваёй краіны.

Вывучэнне новага матэрыялу арганізуецца ў ходзе работы вучняў у 3 мікрагрупах, якія атрымліваюць вучэбна-пазнавальныя заданні для выканання на падставе карты "Отечественная война 1812 г." і параграфа падручніка з дапамогай памяткі (гл. дадатак):

**1 група** – высветліць прычыны вайны, суадносіны ваюючых бакоў і іх планы і скласці храналагічную табліцу "Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі летам 1812 года пры наступленні французскай арміі" (п. 1 §2).

**2 група** – ахарактарызаваць становішча беларускіх зямель у час вайны і адносіны розных слаёў насельніцтва да французскай улады (п. 2-3 §2).

**3 група** – пабудаваць храналагічную табліцу "Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі восенню 1812 года пры наступленні расійскай арміі" і высветліць вынікі вайны для Беларусі (п. 4-5 §3).



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ